# Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г.

*Дук Д.У.*

**Уводзіны.**

Археалагічныя раскопкі ў 2007 г. у г. Полацку праводзіліся на падставе Дазволу № 1789 на форме № 1, выдадзенага ДНУ «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» загадчыку кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» Дуку Д.У. Раскопкі праводзіліся на помніку гісторыі і культуры – полацкім гарадзішчы, якое ўключана ў ахоўную зону Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. У складзе экспедыцыі прымалі ўдзел: старшы выкладчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА «ПДУ» Емяльянчык В.А. (антрапалагічная экспертыза), супрацоўнік Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Волкаў А.І. (рэстаўрацыя знаходак).

Полацкае гарадзішча размешчана на правым беразе р. Палата за 0,8 км ад упадзення яе ў Заходнюю Дзвіну. Было выяўлена ў 1928 г. А.М. Ляўданскім. А.М. Ляўданскі зрабіў на гарадзішчы 3 траншэі і 1 шурф, сумарнай плошчай 20,5 кв. м[1]. Пагорак размешчаны на перасечанай мясцовасці правага берага ракі. Вышыня гары – да 13 м, агульныя памеры 73 х 75 м. Верхняя пляцоўка меншая – 75 х 40 м – і па форме нагадвае прамавугольнік з выступам ва ўсходняй частцы[2] (мал. 1). Пачынаючы з 1947 года гарадзішча шчыльна забудоўваецца, сёння на гарадзішчы размешчана 11 сядзіб з прысядзібнымі ўчасткамі.

Асноўным даследчыкам полацкага гарадзішча ў пасляваенны час з'яўляўся Г.В. Штыхаў. У 1960 і 1962 гг. Г.В. Штыхавым былі пракапаны дзве траншэі, з дапамогай якіх была вызначана стратыграфія старажытных абарончых збудаванняў полацкага гарадзішча. У 1959 г. полацкае гарадзішча даследаваў Л.Д. Побаль, ім было закладзена 4 шурфы[3]. У 1978 г. годзе Вас. В. Булкіным праводзіўся археалагічны нагляд за траншэяй, выкапанай мясцовымі жыхарамі пад склеп[4]. У 1989 г. С.В. Тарасаў праводзіў археалагічнае даследаванне жаночага пахавання, выпадкова раскапанага мясцовымі

---

[1] Ляўданскі А.М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе // Запіскі аддзелу гуманітарных навук БАН. Кн. 2. Працы археолёгічнай камісіі. Т. 2. Мн., 1930. С. 163-165

[2] Штыхов Г.В. Древний Полоцк IX-XIII вв. Мн. 1975. С. 21

[3] Поболь Л.Д. Отчёт об исследовании археологических памятников в г. Полоцке в 1959 г. // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Вопіс 1. Справа № 594. С. 4–5

[4] Булкин В.А. Отчёт об археологических исследованиях Софийского собора и прилегающих к нему территорий в 1978 году // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Вопіс 1. Справа № 594. С. 9–11

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жыхарамі[5]. Сумарная ўскрытая археолагамі плошча культурнага пласта склала каля 80 кв. м, большай часткай гэта былі шурфы А.М. Ляўданскага, Л.Д. Побаля і дзве траншэі Г.В. Штыхава[6].

Мэта раскопак 2007 г. – удакладненне ролі і месца гарадзішча ў сацыятапаграфічнай структуры Полацка IX–XVIII стст., вызначэнне ўзросту помніка, этапаў і працягласці яго існавання.

Папярэдне была заключана вусная дамоўленасць з уладальнікам сядзібы № 20 па 2-му завулку Фрунзэ аб дазволе правядзення на яго ўчастку археалагічных раскопак (мал. 2). Гэта быў адзіны ўладальнік сядзібы на гарадзішчы, які даў дазвол на правядзенне раскопак. Намі было высветлена, што ўвесну 2007 г. уладальнік сядзібы зрабіў перапланіроўку прысядзібнага ўчастка: бульдозерам быў зняты верхні пласт на глыбіню да 0,3 м на плошчы 14 x 12 м. На гэтай плошчы намі быў зроблены раскоп (плошча 44 кв. м) і прадугледжана пляцоўка пад вынятую зямлю (плошча каля 70 кв. м).

Падчас раскопак уладальнік сядзібы ва ультыматыўнай форме запатрабаваў спыніць правядзенне ўсіх работ і засыпаць раскоп. На сітуацыю не паўплываў зварот кіраўніцтва полацкага гарадскога выканаўчага камітэта з просьбай аб дазволе працягнуць раскопкі. У выніку намі было прынята рашэнне ўдвая паменшыць плошчу раскопу і разабраць пласт да мацерыка з глыбіні 1,8 м на плошчы 22 кв. м.

Раскоп 1 мае памер 11 x 4 м. Сярэдняя магутнасць культурнага пласта на гарадзішчы складае 1,8 м, у паўночнай частцы яна максімальная і дасягае 4 м. На месцы раскопу 1 магутнасць культурнага пласта роўная 2,8–3 м.

**Стратыграфія культурнага пласта раскопу 1.**

Культурны пласт раскопу 1 складаецца з трох выразных стратыграфічных гарызонтаў.

*Верхні стратыграфічны гарызонт* – гэта вельмі аднародная зямля светла-шэрага з карычневым адценнем колеру, камкаватая, сухая. У межах гэтага стратыграфічнага пласта былі знойдзены артэфакты пераважна XI–XIII стст., сярод іх рарытэтныя бронзавыя і медныя рэчы (адваротная створка меднага крыжа-энкалпіёна, бронзавыя часткі ківотнага крыжа з выявай Багародзіцы і апостала Іаана, інструмент ювеліра – бронзавая кіянка, свінцовы кісцень, донца бронзавай лампадкі і інш.), жалезныя вырабы (інструменты вытворчасці, зброя і побытавыя рэчы), шкляныя вырабы (пераважна фрагменты шкляных бранзалетаў), рэшткі гаршкоў пераважна XI – пачатку XIV стст., фраг-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[5] Тарасов С.В. Отчёт о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 году // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Вопіс 1. Справа № 1014. С. 23.

[6] За ўвесь час археалагічнага вывучэння гарадзішча сумарна ўскрытая плошча склала каля 80 кв. м, большай часткай гэта былі шурфы А.Н. Ляўданскага, Л.Д. Побаля, дзве траншэі Г.В. Штыхава і назіранні за землянымі работамі Вал. В. Булкіна і С.В. Тарасава.

менты амфар і іншыя рэчы. Усяго ў верхнім стратыграфічным пласце былі знойдзены 104 індывідуальныя знаходкі з агульнай колькасці 496 шт.

У межах верхняга стратыграфічнага пласта было адкрыта і даследавана 35 рознай ступені пашкоджанасці і некранутых пахаванняў. Пахаванні размешчаны на глыбіні ад 0,8 да 1,4 м. Пахаванні зроблены ў пласце зямлі верхняга стратыграфічнага гарызонта. Візуальна контуры пахавальных ям нідзе не прасочваліся. В.А. Емяльянчык праведзена антрапалагічная экспертыза рэшткаў усіх пахаванняў.

Непасрэдна над пахаваннямі былі знойдзены нешматлікія знаходкі, пераважна рэшткі паліванай керамікі і непаліваных гаршкоў, каваныя цвікі, якія датуюцца XVI–XVIII стст. Нешматлікі пахавальны інвентар сведчыць аб прыналежнасці памерлых да каталіцкай канфесіі. З пахавальнага інвентару 16-ці найбольш захаваных і збольшага некранутых пахаванняў (№№ 2, 3, 5, 6, 7, 10, 12, 13, 14, 16, 17, 18, 20, 22, 25, 27) зафіксаваны: два алавяныя нацельныя крыжы, з якіх адзін вельмі пашкоджаны, нацельная ікона-медальён, чатыры шкляныя гузікі, тры бронзавыя засцежкі. Гэтыя рэчы былі знойдзены на целах пяці памерлых (№№ 10, 17, 22, 25, 27). Рэшткі драўляных трун захаваліся толькі ў двух пахаваннях (№№ 11, 27), затое жалезныя цвікі былі знойдзены каля большасці шкілетаў у колькасці ад 1 да 4 штук, што сведчыць аб наяўнасці трун. Большасць пахаванняў арыентаваны галавой на захад (№№ 2, 3, 3б, 4, 5, 7, 11, 13, 14, 16, 18, 20, 26, 27), меншая частка – на паўночны-захад (6, 12, 15, 21 22, 25). Некаторыя пахаванні здзейснены на месцы старых: целы памерлых перакрываюць адно другое (адпаведна №№ 2–3, 15–21). Асобныя пахаванні размешчаны ўпарадкавана адзін каля аднаго: адзін рад пахаванняў №№ 14, 15, 16 перакрывае пахаванні 17, 21. Зафіксавана і парнае пахаванне №№ 20, 27. Выразна прасочваецца тэндэнцыя ў размяшчэнні целаў памерлых: жанчын хавалі са складзенымі на грудзях каля самага падбародка рукамі, кісцямі ўніз (пахаванні 17, 20), адной левай рукой на грудзях, другой – на жываце (пахаванне 7), дзвюма рукамі на жываце (пахаванне 27). Мужчын хавалі з рукамі, складзенымі на жываце (пахаванні 14, 15, 16, 20), складзенымі на грудзях (пахаванні 2, 11), ці рукамі, выцягнутымі ўздоўж цела (пахаванне 18).

*Сярэдні стратыграфічны гарызонт* – гэта пласт зямлі магутнасцю каля 1,4 м з вельмі стракатай структурай. Гэты гарызонт фіксуецца з узроўня каля 0,8–1,2 м. Найбольшая магутнасць пласта ў паўднёва-заходняй частцы (1,6 м), найменшая – у паўночна-ўсходняй (1,2 м).

З верхняй вугальнай прапласткі сярэдняга стратыграфічнага гарызонта атрыманы дзве радыёвуглеродныя даты, матэрыялам з'яўляўся вугаль: кв. 5 проба 1 (далей у тэксце пробы маркіраваны літарай «П») – 430–530 гг. н. ч. (мал. 3; 5), кв. 11 П 2 – 1270–1310 гг. н. ч. (мал. 4; 5)[7]. Апошняя дата цалкам карэлюецца з археалагічным матэрыялам.

---

[7] Радыевуглероднае вызначэнне зроблена ў ДНУ «Інстытут геахіміі і геафізікі» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (лабараторыя геахіміі ізатопаў пад кіраўніцтвам к.т.н. М.Д. Міхайлава).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Так, у археалагічных прапластках верхняй часткі сярэдняга стратыграфічнага гарызонта была знойдзена асноўная колькасць індывідуальных знаходак (315 шт. з агульнага ліку 496 шт.) і керамікі, сярод іх вылучаюцца датуючыя рэчы: жалезныя пласцінкі наборнага даспеха і іх нарыхтоўкі, жалезныя карпусы навясных замкоў і ключы да іх, авальныя жалезныя крэсівы, жалезныя наканечнікі стрэл тыпу «зрэзань», каменныя асялкі, у т. л. з шыфернага сланцу, шыферныя праселкі, вялікая колькасць фрагментаў шкляных бранзалетаў, частка з якіх аплаўлена ў моцным пажары, касцяныя вырабы, у т. л. арнаментаваныя дзяржанні нажоў і касцяная шахмата. З рарытэтных знаходак адзначым бронзавую міску, фрагмент сярэбранай пляцёнкі, накладку на драўляную чашу з выявай грыфона, бронзавую дэталь пэндзля, візантыйскую бронзавую фібулу[8], бронзавую падвеску з раслінным арнаментам, бронзавую дэталь хораса з двухбаковым плеценым арнаментам. Знойдзена шмат вырабаў з чорных (нажы, свярдзёлы і інш.) і каляровых (кісцяні, накладкі на адзенне, дыскападобныя фібулы і інш.) металаў. Знойдзена жалезная сякера рэдкай формы і фрагмент каменнай сякеры ці молата з прасвідраванай адтулінай. З керамікі вылучаюцца кавалкі плінфы. Большая частка венцаў гаршкоў прадстаўлена формамі, характэрнымі для XII – пачатку XIV стст. і добра вядомымі ў іншых гістарычных частках Полацка. Знойдзена некалькі фрагментаў венцаў міскавай кафлі. Такім чынам, большасць рэчаў датуюцца XII – пачаткам XIV стст.

У гэтым пласце знойдзена 6 кавалкаў вохры чырвонага колеру (5 выпадкаў) і 1 кавалак жоўтага колеру. Разам з бронзавай дэталлю пэндзля гэтыя знаходкі можна разглядаць як комплекс з прылады і матэрыялаў мастака.

Сярэдняя частка вызначанага стратыграфічнага гарызонта прадстаўлена пластом аднароднай камкаватай зямлі цёмна-шэрага колеру. Гэтая прапластка мае магутнасць 0,4–0,8 м, у сярэднім 0,5 м.

У гэтай сярэдзіннай частцы вызначанага стратыграфічнага гарызонта знойдзены кавалкі керамічнага посуду, пераважна гаршкоў, якія датуюцца XI–XIII стст. У гэтым пласце зафіксаваны адзінкавыя фрагменты ляпнога посуду апошняй чвэрці I тыс. н. ч. Канцэнтрацыя знаходак у сярэдзіннай частцы вызначанага пласта значна меншая ў параўнанні з верхняй часткай, адпаведна 63 шт. супраць 315 шт. (агульная колькасць – 496 шт.). З індывідуальных знаходак вылучаюцца арнаментаваны бронзавы наканечнік скуранога рамяня, свінцовы бранзалет, верхняя частка трохграннага жалезнага наканечніка стралы, дужка навяснога замка, жалезная стамеска, жалезны рыбалоўны кручок, кавалак смальты зялёнага колеру, кавалкі металічных пласцінак ад даспеха. Рарытэтнай знаходкай з'яўляецца праселка з шыфернага сланца з прадрапанымі літарамі «НАМГ».

[8] Вызначэнне Інгмара Янсана (Стакгольм, Швецыя)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ніжняя частка сярэдняга стратыграфічнага гарызонта мае стракатую стратыграфію. Яе магутнасць каля 0,3–0,4 м. Яна прадстаўлена чаргаваннем прапластак белага зярністага пяску і вапны з вугальнымі прапласткамі. Адзін з пластоў вугалю мае радыёвугляродную дату 60 г. да н. ч. – 140 г. н. ч. (П 5).

Ніжняя мяжа сярэдняга стратыграфічнага гарызонта прадстаўлена прапластачкай вугалю, якая мае радыёвугляродную дату 660–590 гг. да н. ч. (П 6) (мал. 3; 5).

На мяжы кв. 4 і 5 сярэдні стратыграфічны гарызонт дасягае мацерыка ў межах мацерыковай ямы 3. Яма запоўнена пластом чорнай зямлі з вуглем і драўлянай парахнёй. У яме былі знойдзены: 2 косткі жывёл, 30 сценак ляпных гаршкоў, 5 венцаў ляпных гаршкоў, 1 донца ляпнога гаршка, 1 кавалак абпаленай плахі. Венцы ляпнога посуду – гэта тыповыя гаршкі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, якія на тэрыторыі Беларускага Падзвіння датуюцца канцом VIII–X стст.[9] Радыёвугляродная дата кавалка дрэва – 600–780 гг. н. ч. (П 6). Верхняя дата гэтага ханалагічнага адрэзка пацвярджаецца керамічным матэрыялам.

Ніжні пласт сярэдняга стратыграфічнага гарызонта ў кв. 1–3 мае магутнасць 0,2 м і прадстаўлены чорнай, насычанай вуглем зямлёй. Ніжняй мяжой пласта ў кв. 1–3 з'яўляецца прапластка вугалю 0,1 м (кв. 1), перакрытая прапластачкай зярністага пяску (0,1 м магутнасці) белага колеру на мяжы кв. 1 і 2 (мал. 3; 5). Гэтая прапластка вугалю мае радыёвугляродную дату – 130–230 гг. н. ч. (П 7).

У кв. 3 ніжняя мяжа сярэдняга стратыграфічнага гарзонта маркіравана прапластачкай вугалю магутнасцю 0,08–0,1 м, яна пачынаецца ад заходняга краю мацерыковай ямы 4 на мяжы кв. 2 і 3, працягваецца да мяжы кв. 3 і 4, такім чынам яе даўжыня складае каля 2 м. Гэтая прапластка вугалю размешчана на адным узроўні з прапласткай вугалю кв. 1 і 2 (мал. 3; 5), якая ў межах гэтых кв. мае радыёвугляродную дату (П 7). Радыёвугляродная дата пласта вугалю ў межах кв. 3 (П 4) мае інтэрвал 20–220 гг. н. ч. і карэлюецца з датай П 7.

У ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонта былі знойдзены нешматлікія індывідуальныя знаходкі (14 шт. з агульнай колькасці 496 шт.). Сярод іх: бронзавае наверша харугвы, бронзавая падкованападобная фібула з трохгранным сячэннем дужкі, жалезны наканечнік кап'я, сердалікавая шматгранная пацерка, цыліндрычная пранізка зялёнага колеру, зонная пацерка жоўтага колеру, бісер рублены жоўтага колеру, каменная шліфаваная сякера днепра-дзвінскай культуры. Асноўная колькасць ляпной керамікі была знойдзена менавіта ў ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонта. З яе складу вылучаюцца тыповыя формы гаршкоў культуры смаленска-

---

[9] Шмыхаў І.В. Крывічы: На матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Пад рэд. М.А. Ткачова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. Мал. 34, с. 52.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

полацкіх доўгіх курганоў канца VIII–X стст. (большасць усіх венцаў), венцы гаршкоў трэцяй чвэрці I тыс. н. ч., 1 сценка посуду «з расчосамі» сярэдзіны I тыс. н. ч., гаршкі днепра-дзвінскай культуры. Уся лепная кераміка размешчана дысперсна ў ніжнім пласце сярэдняга стратыграфічнага гарызонта, гарызонты залягання асобных тыпаў гаршкоў не вылучаны. Разам з лепной, у гэтым стратыграфічным пласце былі знойдзены венцы ганчарнай керамікі канца X–XI стст. і больш позняй, XI–XII стст.

*Ніжні стратыграфічны пласт раскопу 1* – гэта пласт светла-шэрай з карычняватым адценнем арганікі, вельмі мяккай, сухой і аднароднай па структуры. Гэты пласт мае магутнасць ад 0,2 м (усходняя частка раскопу) да 0,5 м (заходняя частка), прадстаўлены на ўсёй плошчы раскопу, за выключэннем мацерыковых ям 3 і 4. Зафіксаваны на глыбіні каля 2,4–2,5 м. У гэтым арганічным рэчыве, якое вельмі нагадвае торф, адсутнічаюць камяні і вугаль, знаходкі прадстаўлены рэдкімі фрагментамі сценак лепных гаршкоў, а таксама косткамі жывёл, прычым на мяжы сярэдняга і ніжняга стратыграфічных гарызонтаў. Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены паўспарахнеўшым рогавым навершам кап'я.

**Археалагічныя знаходкі.**

Паводле вопісу, калекцыя індывідуальных знаходак налічвае 496 пазіцый, масавых – 3652 пазіцыі. Сярод знаходак прадстаўлены рарытэтныя рэчы з каляровых металаў: адваротная створка меднага крыжа-энкалпіёна XI–XII стст., часткі кіvotнага крыжа з выявай Багародзіцы і апостала Іаана XI–XII стст., інструмент ювеліра – бронзавая кіянка, кісцень, донца бронзавай лампадкі, частка бронзавага ланцугатрымальніка для кадзіла. З калекцыі рарытэтных вырабаў адзначым таксама бронзавую міску, накладку на драўляную чашу з выявай грыфона, бронзавую дэталь пэндзля, візантыйскую бронзавую фібулу[10], фрагмент сярэбранай пляцёнкі, бронзавую падвеску з раслінным арнаментам, бронзавую дэталь хораса з двухбаковым пляцёным арнаментам. Увесь комплекс рэчаў датуецца XII–XIII стст.[11]

У калекцыі вырабаў з бронзы прадстаўлены таксама зашпілька (?), дзяржанне куфра, 2 пярсцёнкі, паясовая накладка, размеркавальнік ювелірных вагаў, фрагменты дроту, абрэзкі пласціны, рамонтныя накладкі на драўляны посуд, скроневае кольца (?), зробленае з жалезнага стрыжня і меднай аплёткі. З каляровых металаў прадстаўлены некалькі вырабаў невядомага прызначэння.

У раскопе знойдзены тры дыскападобныя бронзавыя фібулы XII–XIII стст., якія маюць звонападобны купал, да якога прымацавана вушка-

[10] Вызначэнне Інгмара Янсана (Стакгольм, Швецыя)

[11] Дук Д. Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. № 11. С. 25–31.

дзяржанне. Аналагічныя вырабы былі знойдзены археолагамі Г.В. Штыхавым у Полацку і П.Ф. Лысенкам у Берасці. Паводле атрыбуцыі П.Ф. Лысенкі, гэтыя вырабы з'яўляюцца часткай верхняга касцюма, яны замацоўваліся папарна скуранымі рамянямі і прызначаліся для прадзявання ў проразі верхняга адзення[12]. Знойдзены два бронзавыя вушкі-трымальнікі для посуду. Паводле стратыграфіі, арнаментаваны бронзавы наканечнік скуранога рамяня, свінцовы бранзалет, бронзавае наверша харугвы, бронзавая падкападобная фібула з трохгранным сячэннем дужкі датаваныя часам да XII ст.

Бронзавая дэталь пэндзля з'яўляецца выключна рэдкай знаходкай. Яна ўяўляе сабой трубачку даўжынёй 4,5 см з разрэзам па ўсёй даўжыні. Пасярэдзіне трубачка замацавана бронзавым кольцам з арнаментам у выглядзе насечак. Дыяметр трубачкі – 0,4–0,5 см, канцы пашыраны, дыяметр кольца – 0,5 см, шырыня – 0,4 см. У адзін канец трубачкі прадзявалася драўлянае дзяржанне, у другі – ворс для малявання. Гэтая дэталь пэндзля была знойдзена ў адным пласце з 5 кавалкамі вохры чырвонага колеру (№№ у спісе масавых знаходак 1936, 2274, 3130, 3163, 3182) і 1 кавалкам жоўтага колеру (№ 1836). Вохра прадстаўляе сабой акамянелыя дробнадысперстныя кавалкі колеравага рэчыва вагой да 100 гр. Гэтыя знаходкі – сведчанне пражывання ці працы мастака на полацкім гарадзішчы ў XII–XIII стст.

Бронзавыя засцежкі з пахавальнага адзення XVII–XVIII стст. тыповыя для свайго часу.

Алавяны нацельны каталіцкі крыж XVII ст. з выявай сцэны Распяцця (аверс) і лацінкім надпісам «laureatus» (увенчаны лаўровым вянком) (рэверс) паходзіць з пахавання № 7, таксама як і круглая бронзавая каталіцкая ікона-медальён. Паказальна, што медальён мае дэфармацыю (прыкладна 1/5 частка адламана), аднак гэтая рэч уяўляла каштоўнасць і была пахавана разам з памерлай пахавання № 17.

У раскопе ў колькасці 44 адзінак знойдзены жалезныя пласцінкі наборнага даспеха і іх нарыхтоўкі, два кольцы кальчугі. Пласцінкі даспеха знойдзены ў пласце XII–XIII стст. Сярод іх вылучаецца шырокая пласціна-нарыхтоўка з раскляпанымі, але не завальцаванымі адтулінамі для трымання (памеры 2,5 х 6,5 см), 13 вузкіх пласцінак і іх фрагментаў, якія маюць адзін падоўжаны зубчасты край і дзве ці тры адтуліны для краняжу, адна – пасярэдзіне, дзве – на краях (памеры гэтых пласцінак у сярэднім 1 х 6,5 см). Большасць пласцінак (30 цэлых і фрагментаў) зроблены ў форме крыху выгнутых па даўжыні жалезных палосак з дзвюма-трыма адтулінамі для краняжу.

Зброя прадстаўлена таксама наканечнікамі стрэл, коп'я і сякерай. Жалезная сякера мае рэдкую форму, датуецца, паводле стратыграфіі, XI–XIII стст. У пласце да XI ст. уключна знойдзены жалезны ўтулкавы нака-

[12] Лысенко П.Ф. Открытие Берестья. Мн.: Наука и техника, 1989. С. 102.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нечнік кан'я. Жалезныя наканечнікі стрэл тыпу «зрэзань» датуюцца XII–XIII стст.. Аналагічнае датаванне маюць 5 чаранковых наканечнікаў стрэл. Выключэннем з'яўляецца фрагмент масіўнай трохграннай ў сячэнні стралы, якая знойдзена ў пласце, ранейшым за XII ст.

У раскопе знойдзена тры металічныя корпусы навясных замкоў і ключы да іх. Гэтыя вырабы знойдзены ў пласце XI–XIII стст. Знойдзены таксама авальныя жалезныя крэсівы XII–XIII ст. (два кароткія і адно доўгае) разам з фрагментам калачападобнага крэсіва XI–XIII стст.

У пласце XI–XIII стст. знойдзены тры жалезныя рыбалоўныя кручкі, жалезная дужка ад начыння, жалезная стамеска, шыла. Сабраны жалезныя скабяныя вырабы і дэталі дзвярнога набору, жалезныя дротавыя паўкальцы невядомага прызначэння, жалезная спражка авальнай формы, жалезная шавецкая іголка, два размеркавальнікі. Прызначэнне асобных вырабаў і прылад працы высветліць не ўдалося.

Шкляныя вырабы прадстаўлены вялікай колькасцю фрагментаў бранзалетаў. Бранзалеты двух відаў: з гладкім стрыжнем і віжэвітыя. Колеравая гама – зялёная, жоўтая, блакітная, чорная. Шкляныя пацеркі прадстаўлены жоўтым бісерам, цыліндрычнай пранізкай зялёнага колеру, зоннай пацеркай жоўтага колеру. У раскопе знойдзены таксама 2 кавалкі смальты зялёнага колеру.

Да калекцыі пацерак належаць сердалікавая шматгранная пацерка, якая знойдзена ў перамяшаным пласце ніжняй часткі сярэдняга стратыграфічнага гарызонта, і шасціграная біпірамідальная сердалікавая пацерка, знойдзеная ў пласце XI–XIII стст.

У пласце XI–XIII стст. сабрана вялікая калекцыя каменных асялкоў рознай формы і памераў; некаторыя зроблены з шыфернага сланцу і маюць скразныя дзірачкі для падвешвання. Шыферныя праселкі тыповыя для XII–XIII стст., некаторыя з іх маюць графіці ў выглядзе прадрапаных ліній і літар. Рарытэтнай знаходкай з'яўляецца праселка з шыфернага сланцу з прадрапанымі літарамі «НАМГ».

Касцяныя вырабы прадстаўлены арнаментаванымі і неарнаментаванымі дзяржаннямі нажоў XII–XIII стст. Неарнаментаванае дзяржанне захавалася разам з жалезным тарцовым крапяжом. Касцяная шахматная фігура слана XIII ст. мае аналогіі з вырабам, знойдзеным у Мінску[13]; памеры фігуркі: вышыня 2,2 см, аснова авальная 2 см х 1,5 см. Знойдзена рогавая муфта, два фрагменты двухбаковых касцяных грабянёў (з іх адзін з накладнымі тронкамі), кавалак касцянога дзяржання (?), дзве нарыхтоўкі з косці (адна – рогавай муфты, другая – капавушкі) і фрагмент касцяной накладкі крыху выгнутай падоўжанай формы. Усе гэтыя касцяныя вырабы стратыграфічна датуюцца XII–XIII стст.

[13] Мядзведзева В.У. Сярэдневяковыя шахматы Беларусі (гісторыка-археалагічнае даследаванне). Мн.: ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2005. С. 38.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Паўспарахнеўшае рогавае навершa кап'я (?) знойдзена ў пласце днепра-дзвінскай культуры. Гэтае навершa знойдзена ў комплексе з каменнай шліфаванай сякерай днепра-дзвінскай культуры. Да гэтай жа культуры, відаць, трэба аднесці кавалак каменнай сякеры ці молата з прасвідраванай адтулінай. Выраб зроблены з дробназярністага белага каменю. Гэты выраб быў знойдзены ў пласце XI–XIII стст., аднак яго больш позняе паходжанне не выклікае сумненняў.

З керамікі вылучаюцца кавалкі плінфы. Плінфа прадстаўлена ў выглядзе моцна патрушчаных кавалкаў у колькасці звыш 500 адзінак. Большасць кавалкаў мае сляды рошчыны-цамянкі. Цэлых пласцін знойдзена не было. Па асобных фрагментах можна меркаваць пра таўшчыню плінфы: 2,5 см (2 шт.), 2,8 см (1 шт.), 2,9 см (1 шт.), 3 см (3 шт.), 3,1 см (1 шт.), 3,2 см (1 шт.), 3,4 см (2 шт.), 3,5 см (6 шт.), 3,6 см (1 шт.), 3,9 см (1 шт.), 4 см (1 шт.). Улічваючы вялікую колькасць аплаўленых фрагментаў свінцу, а таксама згорнутых у трубачку свінцовых пласцін, знойдзеных у раскопе кавалкаў смальты і фрагментаў царкоўнага начыння, можна меркаваць аб размяшчэнні непадалёк ад раскопу 1 мураванай царквы.

Зроблена класіфікацыя ўсіх венцаў гаршкоў XI–XIII стст., зробленых на ручным ганчарным крузе. Для класіфікацыі адабраны венцы ў колькасці 1116 шт., па якіх можна меркаваць аб профілі верхняй часткі гаршка. Усе гаршкі падзелены на 9 тыпаў.

Да групы ганчарнай керамікі належаць фрагменты венцаў ё накрывак для гаршкоў, а таксама дзяржанні да іх. Накрыўкі маюць дыяметр 18–30 см і ў двух выпадках аздоблены насечкамі ў тры рады і двума радамі хвалістага арнаменту па вонкаваму краю венца.

Асноўная колькасць лепной керамікі была знойдзена менавіта ў ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонта. З яе складу вылучаюцца тыповыя формы гаршкоў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў канца VIII–X стст. (большасць усіх венцаў). Гэты посуд характэрны для тэрыторыі Беларускага Падзвіння і сустракаецца ў раннегарадскіх напластаваннях канца VIII–X стст. Лукомля, Віцебска і інш. гарадоў (мал. 6; 7: 3; 8: 1, 5; 9: 1, 3–7; 10)[14]. Гэтая група керамікі зроблена з керамічнага цеста, у якім прысутнічаюць грубыя дамешкі жарствы. Паверхня вырабаў няроўная, гузаватая, кераміка мае сляды акапчэння[15].

Асаблівую цікавасць уяўляе комплекс лепной керамікі з мацерыковай ямы 3 (мал. 10). Гэтая кераміка тыповая для раннегарадскіх напластаванн-

[14] Бубенько Т.С., Левко О.Н. Стратиграфия и хронология нижнего слоя Витебска // Материалы по археологии Беларуси. Мн., 2003. Рис. 13; Еремеев И., Штыхов Г. Древний Лукомль. Лепная керамика и раннесредневековый культурный слой // Acta archaeologica Albarutenika. Vol. I (Вып. I). Мн., 2007. Рис. 2–5.

[15] Выказваю шчырую падзяку М.А. Плавінскаму і З.А. Харытановіч за кансультацыю і дапамогу ў апрацоўцы комплексу лепной керамікі з гарадзішча.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

няў гарадоў Беларускага Падзвіння, паводле дадзеных радыёвугляроднага датавання кавалка дрэва з ямы 3, яна была выраблена не пазней 780 г. н. ч.

Да групы ляпнога посуду, відаць, трэба аднесці дзяржанне керамічнай патэльні, знойдзенае ў верхнім стратыграфічным гарызонце.

Венцы гаршкоў трэцяй чвэрці I тыс. н. ч. тыповыя для банцараўскай культуры (мал. 7: 1–2; 8: 2–4; 9: 2; 11), знойдзена 1 сценка посуду «з расчосамі» сярэдзіны I тыс. н. ч.

Большасць венцаў гаршкоў днепра-дзвінскай культуры аздоблена ямкавым арнаментам пад венцам (мал. 12).

Знойдзена 7 дробных фрагментаў венцаў гаршковай (міскавай) кафлі, дыяметр якой мае 12 см. Уяўляе цікавасць сценка начыння, зробленага з белай гліны і аздобленага пераплеценым хвалістым арнаментам. Рэдкімі з'яўляюцца сценкі начыння, зробленага з г. зв. «каменнай масы» і пакрытага з двух бакоў карычневай празрыстай палівай. Знойдзены сценкі амфар, аздобленыя лінейным арнаментам.

Кераміка XVII–XVIII стст. прадстаўлена венцамі паліванай баклагі, збана і іншых вырабаў. Венцы гаршкоў XVII–XVIII стст. тыповыя для свайго часу.

Такім чынам, колькасць і прадстаўнічасць калекцыі знаходак з полацкага гарадзішча пацвярджае высокі сацыяльны статус яго насельніцтва ў XI–XIII стст. Комплекс ляпной керамікі і асобных рэчаў сведчыць аб пражыванні на полацкім гарадзішчы насельніцтва днепра-дзвінскай, банцараўскай культур і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў.

**Высновы.**

Жыццё на гарадзішчы было распачата ў першай палове I тыс. да н. ч., верагодна, каля VII ст. да н. ч. Захаваўся культурны пласт днепра-дзвінскай культуры (ніжняя частка сярэдняга стратыграфічнага гарызонта і ніжні стратыграфічны гарызонт раскопу 1). Паводле радыёвугляроднага аналізу, у стратыграфічным гарызонце днепра-дзвінскай культуры захаваліся праслойкі вугалю ад VII ст. да н. ч. (П 6), да I–III стст. н. ч. (П 5, П 4, П 7). У гэтым пласце дысперсна размешчаны рэчы і кераміка I тыс. да н. ч. – першай чвэрці I тыс. н. ч., сярэдзіны I тыс. н. ч., трэцяй і апошняй чвэрці I тыс. н. ч. Пласт са славянскай керамікай апошняй чвэрці I тыс. н. ч. захаваўся толькі ў межах мацерыковай ямы 3 (радыёвугляродная дата – 660–780 г. н. ч.[16]) (П 3). Верагодна, напластаванні старэйшыя за III ст. н. ч. былі знівеліраваны падчас добраўпарадкавання тэрыторыі гарадзішча. Гэта, дарэчы, тлумачыць факт адсутнасці ляпнога посуду і рэчаў старэйшых за XI ст. у паўднёвай

[16] Ніжнюю мяжу радыёвугляроднай даты ў дадзеным выпадку нельга прыняць у разлік, за час бытавання керамікі прымаецца калібраваны храналагічны дыяпазон, верхняя мяжа якога супадае з тыпалагічным датаваннем керамікі і, такім чынам, прадстаўляе вузкую дату – 780 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

часткі гарадзішча, дзе ўзровень мацерыка больш высокі ў параўнанні з паўночнай часткай гарадзішча (шурфы А.М. Ляўданскага і Л.Д. Побаля).

Калі адбылося гэтае добраўпарадкаванне? Можна выказаць меркаванне, што дзесці ў XI ст. падчас княжання ў Полацку Брачыслава Ізяславіча (1003–1044) ці Усяслава Брачыславіча (1044–1101), вядомымі сваёй шырокамаштабнай будаўнічай дзейнасцю. Рэшткі культурнага пласта трэцяй чвэрці I тыс. н. ч., якія адсутнічае на пляцоўцы гарадзішча, можна выявіць на схіле гарадзішча, дзе археалагічных раскопак дагэтуль не праводзілася.

Культурны пласт XI–XIII стст. выдатна захаваўся, асноўная інтэнсіўнасць жыцця прыпадае на XII–XIII ст. У пласце гэтага часу знойдзена вельмі вялікая колькасць высокамастацкіх вырабаў і побытавых рэчаў. Жыццё на гарадзішчы спынілася ў пачатку XIV ст., што пацвярджае радыёвугляродная дата – 1270–1310 гг. (II 2)[17].

Лакалізацыя ў межах верхняй часткі сярэдняга стратыграфічнага гарызонта абломкаў тыгляў і вырабаў з каляровых металаў, інструментаў вытворчасці, нарыхтовак і гатовых пласцінак наборнага металічнага даспеха дазваляюць вызначыць размяшчэнне ў межах даследуемай тэрыторыі гарадзішча ювелірнай і зброевай майстэрні. Многія са знойдзеных высокамастацкіх вырабаў маглі быць зроблены на месцы[18]. Захаваліся сляды дзейнасці мастака. Верагодна, рамеснікі абслугоўвалі патрэбы княжацкага двара, які размяшчаўся на гарадзішчы на працягу IX–XIII стст.

Асобныя рэчы (кавалкі плінфы, царкоўнае начынне, смальта, свінец і інш.) сведчаць аб размяшчэнні на гарадзішчы паблізу раскопа I мураванага храма.

У XVII–XVIII стст. тэрыторыя гарадзішча ператварылася ў могілкі, на якой хавалі вернікаў каталіцкай канфесіі. Размяшчэнне могілак у цэнтры горада, а таксама канфесійная прыналежнасць да рымска-каталіцкай царквы, дазваляюць зрабіць заключэнне, што на могілках пахавана полацкая шляхта.

Такім чынам, на выніках камеральнай апрацоўкі археалагічнай калекцыі з полацкага гарадзішча можна сцвярджаць, што жыццё на помніку працягвалася з VII ст. да н. ч. да пачатку XIV ст. н. ч. Радыёвугляроднае датаванне вугалю (II 2, 4, 5, 6, 7) і кавалка дрэва (II 3) карэлюецца з рэчавым матэрыялам, знойдзеным у адпаведных прапластках і мацерыковай яме № 3. Выключэннем з'яўляецца проба 1, што сведчыць пра лакальны перакоп і складаны характар працэсу фарміравання культурнага пласта гарадзішча.

---

[17] Другая радыёвугляродная дата – 430–530 гг. н. ч. (II 1) відавочна памылковая, такая пагрэшнасць можа сведчыць пра складаны працэс фарміравання культурнага пласта полацкага гарадзішча, падчас якога вугаль з ніжняга пласта мог трапіць у верхнія гарызонты ў выніку перакопаў

[18] Найбольш паказальна ў гэтым плане знаходка бронзавага барэльефа з выявай апостала Іаана у верхнім стратыграфічны гарызонце. Фігурка мае выразныя сляды адліўкі у форме і шэраг унікальных рыс (палажэнне рук Богамацеры, вугал нахіла яе галавы, асобныя складкі адзення абедзвюх фігурак не супадаюць з вядомымі ўзорамі з іншых земляў)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ганошняе. Выказанае ў найноўшай гістарычнай літаратуры меркаванне М.А. Плавінскага аб адсутнасці на полацкім гарадзішчы рэчавага комплексу IX ст.[19] відавочна награбуе перагляду, паколькі дадзеныя радыёвугляроднага датавання кавалка дрэва з мацерыковай ямы № 3 сведчаць аб пражыванні на гарадзішчы насельніцтва культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў у 780 г., нашмат раней за дату першай летапіснай згадкі Полацка (862 г.).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[19] Плавінскі М. Полацк да Рагвалода (пытанні тапаграфіі і храналогіі культурнага слоя) // Acta archaeologica Albarutenica. Vol. II (Вып. 2) / уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мн.: І.П. Логвінаў, 2007. С. 25-44.




Мал. 1 Археалагічныя раскопы і шурфы на гарадзішчы (паводле С.В. Тарасава):
1–4 – 1928 г., 5–9 – 1959 г., 10 – 1960 г., 11 – 1962 г., 12 – 1978 г., 13 – 1987 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 2. План размяшчэння раскопу 1 на полацкім гарадзішчы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал 3. Гарадзішча. Раскоп 1. Паўночны профіль раскопу.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 4. **Гарадзішча. Раскоп 1. Паўднёвы профіль раскопу.**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 5. Гарадзішча. Раскоп 1. Заходні і ўсходні профілі раскопу.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 6 Гарадзішча. Раскоп 1. Ляпная кераміка.
Малюнак М.А.Плавінскага.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 7. Гарадзішча. Раскоп 1. Ляпная кераміка.
Малюнак М.А. Плавінскага.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 8. Гарадзішча. Раскоп 1. Лепная кераміка.
Малюнак М.А. Плавінскага.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 9. Гарадзішча. Раскоп 1. Ляпная кераміка.
Малюнак М.А. Плавінскага.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал 10 Гарадзішча. Раскоп 1. Ляпная кераміка з мацерыковай ямы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 11. Гарадзішча. Раскоп 1. Лепная кераміка.
Малюнак М.А. Плавінскага.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 12. Гарадзішча. Ляпная кераміка днепра-дзвінскай культуры. Малюнак З.А. Харытановіч.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова